НЯХАЙ ЖЫВЕ 1-е МАЯ—
агляд рэволюцыйных сіл міжнароднага пролетарыята!

1 МАЯ
1939 г.
№ 9 (83)

Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

ЗА ЛЕНІНСКІЯ КАДРЫ

ОРГАН
бюро
партарганізацыі
прафкома,
дырэкцыі
Беларускага
дзяржаўнага
універсітэта

Першае мая

Першае мая — дзень міжпароднай салідарнасці рабочага класа, дзень баявога агляду рэволюцыйных сіл для барацьбы з капіталам.

Сёння міжнародны пролетарыят у пяцідзесяты раз будзе святкаваць сваю маёўку.

Рабочыя капіталістычных краін, усё перадавое чалавецтва згуртоўваецца ў гэты дзень для пратэста супроць зверстваў фашысцкіх канібалаў, супроць насілляў і захватаў фашысцкіх агрэсараў.

Пролетарыят усяго свету будзе выступаць супроць вядучайся другой імперыялістычнай вайны, супроць рыхтуючагася нападу на Совецкі Саюз. Гэта будзе грозным папярэджаннем такім «любіцелям геаметрыі», як «трохвугольнік Берліп—Рым—Токіо».

Подлы ўдар у спіну не зламу гераічны іспанскі народ. Іспанскі народ у рэволюцыйных баях скіне катаў і заваюе незалежнасць і свабоду.

Перамога будзе і на старане вялікага кітайскага народа, які прагоніць японскіх захватчыкаў з роднай зямлі.

З надзеяй і гарачай любоўю працоўныя усяго свету глядзяць на СССР. Перамога соцыялізма ў Совецкім Саюзе натхняе іх па барацьбу за шчасце чалавецтва.

Совецкі народ сустракае Першае мая велічнымі перамогамі.

У СССР ліквідаваны ўсе эксплаататарскія класы. Совецкі народ не ведае эксплаатацыі і прыгнечання чалавека чалавекам, не ведае крызісаў і беспрацоўя, голаду і галечы. Яны зніклі ў нашай краіне назаўсёды. «Зайздросцім унукам і праўнукам нашым, — пісаў Белінскі, — якім суджана бачыць Расію ў 1940 годзе — стаячую на чале адукаванага свету, даючую законы і навуцы і мастацтву, і прымаючую пачцівую дань ад усяго адукаванага чалавецтва».

Збылося прадбачанне «неистового Виссариона» раней, чым ён думаў. Пад кіраўніцтвам партыі, правадыра народаў таварыша Сталіна совецкі народ пабудаваў соцыялізм і цвёрдай хадою прыбліжаецца к комунізму, узброіўшыся гістарычнымі рашэннямі XVIII з'езда большэвіцкай партыі.

На заклік таварыша Сталіна дагнаць і ў эканамічных адносінах найбольш развітыя капіталістычныя краіны, совецкі народ адказаў магутным уздымам соцыялістычнага спаборніцтва імені Трэцяй Сталінскай Пяцігодкі.

Народы СССР сустракаюць першамайскае свята ў сазнанні сваёй магутнасці, маральна-палітычнага адзінства, з гордым усведамленнем свайго цудоўнага цяперашняга і вялікага будучага. Яны прадэманструюць сваю гатоўнасць у любы момант стаць на абарону соцыялістычнай радзімы.

Шчаслівая моладзь нашай краіны весела і радасна святкуе Першае мая. Совецкае студэнцтва — адзін з многалікіх атрадаў нашай інтэлігенцыі — прадэманструе ў дзень пролетарскага свята свае імкненні к вышыням навукі, сваю згуртаванасць, адданасць справе Маркса—Энгельса—Леніна—Сталіна.

Пад чырвонымі сцягамі студэнты, навуковыя работнікі нашага універсітэта прынясуць у дзень Першага мая сваю волю стаць дастойнымі выхавацелямі маладога пакалення совецкага народа, сваю адданасць і бязмежную любоў к дарагому таварышу Сталіну.

Няхай жыве Першае мая!

Няхай жыве мудры арганізатар баявых маёвак пролетарыята, правадыр усяго працоўнага чалавецтва вялікі Сталін!

Няхай жыве комсамол—верны памочнік і магутны рэзерв большэвіцкай партыі! Няхай жыве працоўная моладзь нашай радзімы!